Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. АЎТОРАК №190 (28554)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



### Што пачым на кірмашах?

СТАР. 8



### Украіна і Беларусь. Разам і… паасобку?

СТАР. 9



### Пякотка — хвароба страўніка ці страравода?

СТАР. 15

# Навасельскія дакопкі



Жыхаркі вёскі Наваселле Шаркаўшчынскага раёна Раіса ВЯРЦІНСКАЯ (за рулём) і Алена ПЯТКУН вязуць з сотак выкапаную бульбу. Жанчыны працуюць у сельскай гаспадарцы: Раіса — цялятніцай, а Алена — поварам.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:**

*«Па выніках студзеня-жніўня гэтага года сярэдняя заработная плата адстае ад устаноўленага графіка ў асобных рэгіёнах і асобных відах дзейнасці. Разам з тым, планавае заданне па забеспячэнні ўзроўню заработнай платы ў сярэднім па рэспубліцы ў 1 тыс. рублёў будзе выканана. З верасня павышана тарыфная стаўка першага разраду для работнікаў бюджэтнай сферы, а таксама заработная плата дзяржслужачых. Гэта акажа свой уплыў на паказчыкі росту зарплаты ў цэлым па краіне».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9620 | ▼ |
| Еўра | 2,3032 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0339 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0737 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# СУЧАСНАЕ ЗАКАНАДАЎСТВА — ВАЖНЫ ФАКТАР СТАБІЛЬНАСЦІ І РАЗВІЦЦЯ ГРАМАДСТВА

*Выступленне старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Мясніковіча М. У. на адкрыцці трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*



Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя!

Сёння «партфель» законапраектаў, якія плануюцца да разгляду падчас восеньскай сесіі парламента, налічвае амаль паўсотні дакументаў.

Трэба будзе прыняць рашэнні па ўдасканаленні адносін у сферы дзяржаўна-прыватнага партнёрства, процідзеяння манапалістычнай дзейнасці і развіцця канкурэнцыі, дзяржаўных закупак, дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, абароне правоў спажыўцоў. Плануецца карэкціроўка шэрагу кодэксаў Рэспублікі Беларусь па пытаннях грамадскай бяспекі, судаводства, законаў па пытаннях барацьбы з тэрарызмам і абароны, інтэлектуальнай уласнасці, фізічнай культуры і спорту і іншых сфер заканадаўчага рэгулявання. Значная частка праектаў нацэлена на ўключэнне ў прававую сістэму краіны палажэнняў міжнародных дамоўленасцяў Рэспублікі Беларусь.

Традыцыйна восень з'яўляецца часам для актыўнага і шырокага абмеркавання пакета бюджэтных законапраектаў на наступны год. Гэта адна з ключавых задач на бягучую сесію Савета Рэспублікі. Фарміраванне бюджэту будзе праходзіць няпроста. Запытаў шмат, а сродкаў недастаткова. Трэба задзейнічаць усе рэзервы і забяспечыць руплівае выкарыстанне кожнай капейкі са сродкаў падаткаплацельшчыкаў.

Важная частка парадку дня — бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, які ў апошнія гады, на жаль, вымушаны падсілкоўваць сродкамі дзяржбюджэту, што выклікае трывогу. Чаму гэта адбываецца? З-за падзення колькасці занятых у эканоміцы, а таксама перавышэння звальненняў работнікаў над прыёмам (а гэтыя тэндэнцыі маюць месца) памяншаецца аб'ём фонду аплаты працы, што цягне скарачэнне даходаў бюджэту фонду.

СТАР. 3

# АДКАЗВАЮЧЫ НА ВЫКЛІКІ ЧАСУ

*Выступленне старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанкі У. П. на адкрыцці трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання*



Паважаныя дэпутаты, члены ўрада і запрошаныя!

Пачынае работу трэцяя сесія Палаты прадстаўнікоў. Яна пройдзе пад знакам выканання патрабаванняў кіраўніка дзяржавы, накіраваных на забеспячэнне дынамічнага эканамічнага росту, развіццё дзелавой ініцыятывы, адстойванне нацыянальных інтарэсаў.

Ключавое месца на сесіі адводзіцца пакету бюджэтных законапраектаў. Краіна павінна своечасова атрымаць галоўны фінансавы дакумент, які фарміруе надзейныя ўмовы для замацавання і развіцця пазітыўных тэндэнцый.

Праекты, прадстаўленыя ўрадам у рабочым парадку, ужо змяшчаюць прапановы дэпутатаў, і працягваць работу над імі неабходна аб'ектыўна ацэньваючы перспектывы сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Важную ролю ў разняволенні дзелавой ініцыятывы закліканы адыграць праекты законаў, накіраваныя на супрацьдзеянне манапалізму, развіццё канкурэнцыі, паляпшэнне бізнес-клімату, банкаўскай сістэмы, дзяржаўна-прыватнага партнёрства, забеспячэнне празрыстасці дзяржаўных закупак. Акрамя таго, у Палату прадстаўнікоў будуць унесены яшчэ два законапраекты па пытаннях прыцягнення інвестыцый і развіцця прыватызацыі, якія распрацаваны дэпутатамі з улікам грамадскага абмеркавання.

Мы працягнем удасканаленне законаў сацыяльнага блока. Зменены планаецца ўнесці ў законы аб пенсійным забеспячэнні. Прадугледжана зніжэнне страхавога стажу да 10 гадоў для асоб, якія доўгі час знаходзіліся на ваеннай службе, даглядалі дзяцей-інвалідаў, інвалідаў I групы, састарэлых. Карэкціроўка Закона «Аб ветэранах» пашырыць магчымасці фінансавання мерапрыемстваў, якія праводзяцца грамадскімі аб'яднаннямі ветэранаў, узмоцніць гарантыі іх сацыяльнай абароны. У Закон «Аб фізічнай культуры і спорце» ўносяцца нормы, накіраваныя на павышэнне адказнасці за рацыянальнае выкарыстоўванне дзяржаўных сродкаў пры падрыхтоўцы спартсменаў і стварэнне новых стымулаў для дасягнення высокіх вынікаў у спорце.

СТАР. 3